**Інтэлектуальная культура і самаідэнтыфікацыя асобы**

*У. Л. Аляксандраў*

З пункту гледжання сацыялогіі чалавек у першую чаргу ўяўляе сукупнасць статусаў і роляў.

Кожны статус ёсць сукупнацсь аб'ектыўных і суб'ектыўных характарыстык. Да апошніх належыць сярод іншага успрыманне і асэнсаванне свайго статуса, ацэнка яго зместу (правоў, абавязкаў, нормаў узаемадносінаў), ацэнка яго месца у сацыяльнай структуры, суадносінаў з іншымі сваімі і чужымі статусамі і г.д.. У сваю чаргу характар гэтага успрымання і асэнсавання, уключаючы розныя псіхалагічныя аспекты (эмацыянальныя, валявыя, каштоўнасныя), у першую чаргу залежыць ад інтэлектуальнай культуры чалавека, г.зн. узроўню і якасці мыслення.

Вядома, што ў дынаміцы асабістага і сацыяльнага жыцця актуалізацыя статусаў нераўнамерная, у розныя моманты на першы план выходзяць некалькі ці адзін з іх. У якіх сітуацыях чалавек кажа (ці думае): "я - беларус", "я – мінчанін, "я – бацька", "я – настаўнік ", "я - праваслаўны"?

Па-першае, калі яго просяць ідэнтыфікаваць сябе па той ці іншай сацыяльнай шкале (знаёмыя, сацыёлагі, чыноўнікі, перапісчыкі). Па-другое, калі сама жыццёвая сітуацыя, сацыяльныя стасункі і дзеянні патрабуюць такой самаідэнтыфікацыі: выклік ў школу бацькі з-за дзіцяці, абарона радзімы з-за агрэсіі, падрыхтоўка да заняткаў і іх правядзенне і г.д.

Усе гэтыя сітуацыі вымагаюць пэўнай інтэлектуальнай актыўнасці, праявы ўменняў аналізаваць, абагульняць, параўноуваць, абстрагавацца, вызначаць, класіфіцыраваць, мадэліраваць, праводзіць аналогіі, рабіць высновы.

У адных выпадках простым і відавочным, амаль аўтаматычным, напаўсвядомым будзе як сам працэс самаідэнтыфікацыі, так і вынікаючыя з яго наступствы, напрыклад, дзеянні: "Зараз я – пешаход, павінен выконваць правілы дарожнага руху, таму чакаю зялёнага святла". У другіх выпадках не выклікае складанасцяў самаідэнтыфікацыя, але ўзнікаюць пытанні да яе змястоўнага напаўнення: што можна ці нельга рабіць, як ставіцца да нечага ці некага? Напрыклад, чалавек усведамляе сябе патрыётам, але хістаецца ў выбары сродкаў абароны айчыны; бацька лічыць неабходным пакараць сына, але не ведае, ці варта і ці можна выкарыстоўваць фізічную сілу. У трэціх выпадках нават атаясамленне з тым ці іншум статусам уяўляе велізарную псіхалагічную, экзістэнцыяльную, а значыць і інтэлектуальную

праблему: “я – вернік?”, “я – алкаголік?”, “я – здраднік (сябра, сям’і, радзімы)?”.

Яшчэ складаней справа з ацэнкай статуса, яго размяшчэннем у сістэме маральных, палітычных, ідэалагічных, культурных, эканамічных і іншых каардынат. З сацыялагічных даследванняў нярэдка, напрыклад, вынікае, што пэўная частка апытаных па аб’ектыўных сацыяльна-эканамічных крытэрыях адносяцца да катэгорыі “бедных”, а самі адносяць сябе да “сярэдняга класу”: відавочна, працуе механізм псіхалагічнай абароны.

Лёгка вызначыць і сказаць: “Я – грамадзянін, муж,бацька, настаўнік“, значна цяжэй: “Я – добры грамадзянін і г.д.” Інтэлектуальная дзейнасць у такіх выпадках заключаецца ва ўменні разважаць над “сакратаўскімі” пытаннямі: “што значыць быць добрым грамадзянінам?”, а затым, сфармуляваўшы адказ, даць крытычную самаацэнку і размясціць сябе на пэўнай рысе шкалы грамадзянскаці, прафесіяналізму і інш.

Сярод усіх складнікаў самаідэнтыфікацыі чалавека асаблівую ролю адыгрываюць ідэнтычнасці грамадзянска-дзяржаўныя, этнічныя, канфесійныя, палітыка-ідэалагічныя. Бясспрэчна важнасць атаясамлівання асобы з буйнымі супольнасцямі і інстытутамі, перашаснымі ў грамадска-гістарычных працэсах (народы, дзяржавы, цэрквы, палітычныя партыі). Наступствы гэтага атаясамлівання могуць быць як станоўчымі для чалавека і грамадства (альтруізм, патрыятызм, супольная стваральная дзейнасць), так і негатыўнымі (ад унутрыасобаснага канфікту і крызісу да глабальных катастроф).

У гэтым святле тым большую значнасць набывае інтэлектуальная культура чалавека і грамадства. Рацыянальнае, г.зн. абгрунтаванае, разважлівае, рэфлесіўнае, крытычнае і самакрытычнае, мысленне павінна спрыяць глыбокаму асэнсаванню працэсаў самаідэнтыфікацыі асобы. Сістэма дзяржаўнай і па-за дзяржаўнай адукацыі і выхавання абавязкова павінна фармуляваць мэты, задачы і ствараць адпаведныя ім сродкі, умовы інтэлектуальнага суправаджэння гэтага працэсу. Няпэўнасць мэтаў, недасканаласць сродкаў ёсць адной з прычынаў крызісу самаідэнтычнасці, уцягвання людзей, асабліва моладзі, у крымінальныя і дэструктыўныя супольнасці, пашырэння алкагалізму і наркаманіі.

У якасці прыкладу крызісных працэсаў возьмем адзін са складнікаў ідэнтычнасці асобы – прыналежнасць яе да дзяржавы. Як вядома, распад СССР суправаджаўся не толькі глыбокім сацыяльна-эканамічным і

Бібліятэка БГУИР

палітычным крызісам, але і для многіх – крызісам грамадзянскай ідэнтычнасці. Мільёны людзей (асабліва перасяленцы ў першым ці другім пакаленні) з цяжкасцю ўспрымалі сябе грамадзянамі новай суверэннай дзяржавы, па-ранейшаму адчуваючы сябе "савецкімі людзьмі", альбо з абвостранымі пачуццямі ўсведамлялі сваю этнічную ідэнтычнасць (нацыянальнасць). Часткова да апошняга спрычыніўся і сам Савецкі Саюз, у якім негледзячы на афіцыйна агалошаныя інтэрнацыяналізм і “сяброўства народаў”, у анкетнай і іншай дакументацыі ўпарта захоўвалася графа “нацыянальнасць”. І пасля краху дзяржавы гэты “пяты пункт” у свядомасці і самаідэнтыфікацыі некаторых людзей перасунуўся ледзь не на першае месца. Многія і дагэтуль не могуць уцяміць, што паняцці “беларус”, “украінец”, “рускі”, “літовец” ёсць не толькі этнонімамі, што ў сучасным свеце яны павінны напаўняцца перш за ўсё дзяржаўна-палітычным, грамадзянскім зместам. Беларус (літовец) – значыць грамадзянін Беларусі (Літвы). Гэту нібыта банальную ісціну яшчэ доўга і настойліва прыйдзецца засвойваць жыхарам былога СССР. І менавіта роля ўстановаў адукацыі і культуры, сродкаў масавай інфармацыі і грамадскіх аўтарытэтаў, палітычных партый і дзяржаўных дзеячоў надзвычай вялікая ў тым, каб гэтае ўсведамленне адбывалася больш хутка і неканфліктна.

Калі казаць пра навучальны працэс, то тут на першы план выходзяць сацыяльныя і гуманітарныя дысцыпліны: гісторыя, псіхалогія, сацыялогія, паліталогія, філасофія, логіка, этыка. Напрыклад, выкладчык логікі можа і абавязаны растлумачыць студэнтам, што паняцце “беларус” мае розныя дэнататы (значэнні); гісторык – як гэтыя значэнні трансфарміраваліся з часам; палітолаг і сацыёлаг – указаць на важнасць грамадзянскага, а не вузка этнічнага ўжывання гэтага паняцця; псіхолаг – дапамагчы раскрыць механізмы атаясамлівання асобы з адпаведнай супольнасцю праз інтарэсы, пачуцці, мысленне, дзеянні; філосаф – раскрыць складаную дыялектыку суадносін нацыянальных і інтэрнацыянальных, дзяржаўных і міжнародных, палітычных і культурных аспектаў быцця “чалавека як беларуса” у сучасным глабальным свеце.

Як паказваюць некаторыя драматычныя падзеі вакол нас, цана памылак і хібаў навучання і выхавання ў фарміраванні ідэнтычнасці асобы можа быць надзвычай высокай.

Библиотека БГУИР